**Мазанік В.У.,**
суіскальнік кафедры
народна-інструментальнай творчасці

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ І АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ АРКЕСТРАВАГА ДЫРЫЖОРСКАГА МАСТАЦТВА ВІЦЕБСКА (1918—1921 гады)

Пачатак XX ст. характарызуецца складаным гістарычным становішчам (першая сусветная вайна, рэвалюцыі 1905 г. і 1917 г., грамадзянская вайна), у выніку якога парушыўся ўклад культурнага і музычнага жыцця гарадоў Беларусі. У сувязі з гэтым спынілі існаванне шматлікія прафесійныя і аматарскія аркестравыя калектывы. Нягледзячы на цяжкасці, далейшы шлях развіцця музычнай культуры быў звязаны са значнымі пераўтварэннямі ў галіне. Адным з важных момантаў музычнага мастацтва гэтага перыяду можна лічыць адкрыццё народных кансерваторый у Віцебску (1918 г.), Мінску і Гомелі (1919 г.), Бабруйску (1921 г.), што ў далейшым пераўтвараюцца ў музычныя тэхнікумы і школы. Неабходна адзначыць, што яны не толькі выконвалі ролю навучальных устаноў, якія рыхтавалі прафесійных музыкантаў, але і з'яўляліся цэнтрамі культуры, што выконвалі музычна-асветніцкія і культурна-развіццёвыя функцыі.

Так, стварэнне ў 1918 г. у Віцебску на базе народнай кансерваторыі сімфанічнага аркестра дазваляе гаварыць аб далейшым развіцці прафесійнага аркестравага выканання Беларусі. Дзякуючы дзейнасці Віцебскага сімфанічнага аркестра — аднаго з лепшых — з'яўляюцца іншыя калектывы: сімфанічны аркестр у Магілёве (1919 г., кіраўнік С.Пеўзнер), сімфанічны аркестр у Гомелі (1919 г., кіраўнік Л.Захарын). У Мінску цэнтрамі аркестравай дзейнасці былі Беларускі музычны тэхнікум, першы беларускі драматычны тэатр (БДТ-1), пазней — музычны сектар Усебеларускага камітэта радыёвяшчання.

Інтэнсіўная, плённая канцэртная дзейнасць сімфанічных аркестраў Мінскага музычнага тэхнікума і БДТ-1 дазволіла ўбачыць далейшую перспектыву аркестравага выканання ў рэспубліцы — стварэнне Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра, які быў сфарміраваны кіраўнікамі А.Бяссмертным і І.Гітгарцам з ліку вядучых аркестрантаў гэтых калектываў.

Аналізуючы працэс развіцця аркестравага выканання, выяўляючы яго асаблівасці, мы прыйшлі да высновы, што перыяд, храналагічныя рамкі якога абмежаваны 1918—1921 гадамі, мае сваю спецыфіку, характарызуецца пэўнымі мастацкімі праблемамі і колам творчых задач.

Характэрная асаблівасць указанага перыяду — удалае спалучэнне канцэртна-выканальніцкай дзейнасці з мастацка-асветніцкай работай. Гэта выявілася ў творчых пошуках сімфанічнага аркестра Віцебска, дзейнасць якога неабходна разгледзець больш падрабязна.

З розных беларускіх гарадоў значным культурным узроўнем вылучаўся Віцебск. Дасягненні як у развіцці мастацтва (у тым ліку музыкі), так і ў арганізацыі культурна-асветных устаноў шмат у чым вызначылі культурна-мастацкую атмасферу горада. Акрамя гэтага, адзначым дзейнасць вышэйшых мастацкіх майстэрань, драматычных тэатраў, народнай кансерваторыі — усё гэта вылучала Віцебск з іншых гарадоў Беларусі.

Звернемся да дзейнасці Віцебскага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам М.А. Малько, які зрабіў значны ўклад у музычную культуру не толькі горада, але і ўсёй рэспублікі. Сам факт з'яўлення ў горадзе ўкамплектаванага сімфанічнага аркестра на чале з вядомым дырыжорам успрымаўся як падзея выключнай важнасці. Як адзначалася ў тагачасным перыядычным друку, "...рабочы і селянін, інтэлігент, пралетарый і дробны рамеснік маюць магчымасць слухаць у садзе Свярдлова рэдкі аркестр, які ў старыя часы граў толькі ў салонах і пры царскім двары. Апрача таго, ладзяцца спецыяльныя агульнадаступныя канцэрты для чырвонаармейцаў, рабочых і навучэнцаў".

адзначым інтэнсіўнасць канцэртнай дзейнасці калектыву, які амаль штодня, як паведамляе прэса, выступаў з канцэртамі перад шматлікай публікай.

Такі рэжым творчай работы патрабаваў пошуку аптымальных формаў арганізацыі выступленняў калектыву. Ні адно буйное мерапрыемства — палітычны мітынг, выступленне творчага калектыву, правядзенне спектакляў папулярнага тады Тэатра рэвалюцыйнай сатыры — не абыходзілася без уключэння ў праграму канцэртаў сімфанічнага аркестра.

Вылучым яшчэ адну форму работы — арганізацыю лекцый. Яны карысталіся незвычайнай папулярнасцю і эфектыўна выконвалі асветніцкую працу сярод прадстаўнікоў розных сацыяльных і ўзроставых груп. З дакладамі, лекцыямі перад слухачамі выступалі вядомыя дзеячы літаратуры і мастацтва. У адной з публікацый адзначалася: “У выніку таго, што пытанні мастацтва глыбока цікавяць народныя масы, губпададдзел мастацтваў пачынае арганізацыю шэрага дыскусій па пытаннях літаратуры, жывапісу і музыкі. Дакладчыкамі прызначаны П.Н.Мядзведзеў, С.О.Грузенберг, Л.В.Пумпянскі, М.А.Малько, Э.Е.Белінг, М.М.Малкін і інш”.

Грунтоўных рэцэнзій і разгорнутых публікацый, якія асвятлялі б дзейнасць Віцебскага сімфанічнага аркестра, не выяўлена. Толькі лаканічная інфармацыя, змешчаная ў мясцовай прэсе, дае магчымасць устанавіць факт правядзення канцэртаў калектыву. Аналіз перыядычнага друку таго часу дазволіў нам знайсці адзін з водгукаў на канцэрт сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам М.А.Малько, што адбыўся 13 кастрычніка 1920 г. у памяшканні Латышскага клуба. Газета “Известия Витебского губревкома и губкома РКП” паведамляе наступнае: “Чырвонаармейцы і грамадзяне горада атрымалі вялікае задавальненне, праслухаўшы творы славутага нямецкага кампазітара ў добрым выкананні аркестра і пад адказным кіраўніцтвам. У праграме вечара быў Мендэльсон.



Рэпазіторый БДУКІ

Выбар музычных твораў і іх выкананне трэба прызнаць вельмі ўдалымі і выхаваўча карыснымі для аўдыторыі чырвонаармейцаў і працоўных г. Віцебска".

Праграма канцэртаў была вельмі разнастайнай — ад нескладаных партытур да сімфанічных твораў буйной формы. Напрыклад, у лістападзе 1918 г. у канцэрце прагучалі такія творы, як "Гэй, грымнем" А. Глазунова, "Вязень" А. Грачанінава, "Каваль" Цыдэмана (выканаўца праф. Віцебскай народнай кансерваторыі К.А.Зімін), а таксама "Італьянскае капрычыо" П.Чайкоўскага і "Эгмант" Л.Бетховена. Да таго ж, аналізуючы рэпертуар Віцебскага сімфанічнага аркестра, адзначым выкананне такіх твораў, як Першая, Чацвёртая, Пятая, Шостая сімфоніі і сімфонія "Манфрэд" П.Чайкоўскага, усе сімфоніі (акрамя Дзевятай) Л.Бетховена, сімфоніі В. Моцарта, Р.Шумана, Б.Мендэльсона, творы Г. Берліёза, Ж.Бізэ, Р.Вагнера і інш. Сярод высокамастацкага рэпертуару, узораў сусветнай класікі асобна вылучым творы (уверцюра "Рабесп'ер" Літольфа), якія адпавядалі патрабаванням часу, былі сугучныя з эпохай.

Фарміраванне рэпертуару з твораў гэтага ўзроўню было недасяжным для многіх калектываў. У Віцебскага сімфанічнага аркестра з'явілася магчымасць укамплектаваць нотную бібліятэку партытурамі вядомых выдавецтваў. Такую вялікую і цікавую праграму аркестр меў дзякуючы сваёй выдатнай нотнай бібліятэцы, вывезенай з нацыяналізаваных петраградскіх складаў выдавецтваў Бяляева, Юргенсона, Гутхейля, Цымермана, дзе захоўвалася вялікая колькасць унікальных выданняў. Сярод шматлікіх партытур былі творы кампазітараў XIX — пачатку XX стагоддзя К.Дэбюсі, М.Равэля, Сен-Санса, Руселя, Дзюка, Рэгера і інш. На жаль, з цягам часу гэтая бібліятэка, што складалася з рэдкіх выданняў, была амаль поўнасцю страчана.

Падрабязна разглядаючы дзейнасць аркестра, мы прыйшлі да наступнай высновы: напружаная, настойлівая работа дырыжора дазволіла калектыву дасягнуць высокага

прафесіяналізму ў выкананні найскладанейшых сімфанічных твораў. Нягледзячы на тое, што ў рабоце аркестра прымалі ўдзел такія таленавітыя музыканты, як скрыпач Г.Шэйдлер (канцэртмайстар аркестра), піяніст Э.Бай, віяланчэліст С.Шпільман, у склад аркестра ўваходзілі музыканты-аматары, якім неабходна было прывіваць навыкі культуры аркестравага выканання. Як адзначалі сучаснікі, дырыжору М.А.Малько "са звычайных музыкантаў кінематографаў і вясельных... удалося на працягу апошняй зімы стварыць сур'ёзных музычных работнікаў".

Нягледзячы на высокі ўзровень арганізацыі работы, дастатковасць дырыжорскіх валявых якасцей, М.А.Малько не заўсёды быў упэўнены ў канчатковым выніку. У пісьме да І.Міклашэўскага М.А.Малько выказвае сумненні адносна работы з аркестрам: "...мне хацелася асвятліць Вам карціну тутэйшай аркестравай работы, пры якой зусім нельга паручыцца за тое, што ўдасца выканаць які-небудзь план". У дзённікавых запісах дырыжор вельмі падрабязна апісвае пачатковы перыяд працы ў Віцебску: "Спачатку я думаў, што нічога не атрымаецца: паспрабаваў іграць — какафонія, да таго ж многіх не хапала. Музыкант які-небудзь, што пры бліжэйшым разглядзе, аказваецца, або не іграе, або іграе так, што лепш бы ён не іграў".

Гэтыя матывы часта адцягвалі дырыжора ад вырашэння мастацкіх задач. Але дзякуючы яго прафесіяналізму любы канцэрт сімфанічнага аркестра станавіўся сапраўдным святам музычнага мастацтва ў Віцебску. У перыядычным друку адзначаўся факт таго, што канцэрты збіралі велізарную колькасць людзей, якія мелі магчымасць "...атрымаць рэдкае для правінцыі эстэтычнае задавальненне".

Безумоўна, гэтая заслуга належыць таленавітаму музыканту і дырыжору М.А.Малько, бо, як вядома, дзейнасць калектыву, яго прафесійны ўзровень вызначае асоба дырыжора. Аднак, як сказаў у сваім інтэрв'ю старэйшы беларускі музыказнаўца Б.С.Смольскі,



Рэпазіторый БДУКіМ

сімфанічны аркестр Віцебска быў “пецярбургскім аркестрам” паводле свайго складу, а значыць, яго выканальніцкі ўзровень, нягледзячы на прысутнасць музыкантаў-аматараў, меў пэўную вышыню. Справа ў тым, што сталічныя музыканты апынуліся ў Віцебску ў выніку вельмі празаічных абставін, што пацвярджае сам М.А.Малько: “...у правінцыі ў гэты час жыць было параўнальна лягчэй, чым у сталіцах. У абедзвюх сталіцах — Пецярбургу і Маскве — жыць станавілася ўсё цяжэй, было галадна і холадна, а ў Віцебску і хлеба, і паліва было больш”.

Тут варта звярнуць увагу на ролю вядомых дзеячаў музычнай культуры ў станаўленні не толькі прафесійнага майстэрства сімфанічнага аркестра, але і нацыянальнай музычнай культуры ў цэлым. Існаванне ў Віцебску кансерваторыі, якая вылучалася сярод іншых навучальных устаноў сваім педагагічным складам, стала дабратворным для развіцця музычнай культуры Беларусі. Сярод выкладчыкаў кансерваторыі, напрыклад, можна назваць вядомага рускага скрыпача прафесара К.Грыгаровіча, піяніста, лаўрэата Першага Міжнароднага конкурсу піяністаў імя А.Рубінштэйна прафесара Н.Дубасава, артыста аркестра Марыінскага тэатра габаіста С.Браўдэ, трамбаніста Я. Райхмана, які па запрашэнні С.Кусявіцкага іграў у Бостанскім аркестры, вакалістаў-салістаў Марыінскага тэатра і інш. М.А.Малько, дырыжор класічнай музычнай школы, музыкант высокай культуры, што меў багатую музычную эрудыцыю, велізарны педагагічны талент, служыў выхаванню і развіццю выканальніцкай культуры Віцебскага сімфанічнага аркестра. Усё гэта, разам узятае, і дазволіла калектыву дасягнуць высокага прафесійнага ўзроўню.

Наведвалі Віцебск і гастралёры: драматычныя акцёры, музыканты. Так, два канцэрты сімфанічнага аркестра прайшлі пад кіраўніцтвам таленавітага французскага дырыжора і кампазітара Анры Фартэра. Канцэрты, праведзеныя Анры Фартэрам, унеслі асаблівы ўклад у



Репозиторий БГУКИ

музычнае жыццё горада. Як адзначыў адзін з рэцэнзентаў, "дырыжыраванне А.Фартэра ўзмацніла значэнне Віцебскага дзяржаўнага аркестра. На працягу некалькіх дзён А. Фартэру ўдалося авалодаць аркестрам, улічыць усе слабыя і моцныя яго бакі". Акрамя гэтага, рэцэнзент характарызуе А. Фартэра як дырыжора буйнога маштабу, з добрым веданнем партытур і інструментоўкі, што мае вялікую музычную эрудыцыю. Безумоўна, працуючы з такім дырыжорам, мясцовыя музыканты знаёміліся з новымі для іх школай і выканальніцкай культурай, набываючы неабходныя навыкі аркестравага выканання.

З сімфанічным аркестрам працавалі і выступалі іншыя дырыжоры: Г.Г.Шэйдлер (сын скрыпача Г.І.Шэйдлера), што быў другім дырыжорам аркестра, Э.Е.Белінг, які потым стаў дырэктарам кансерваторыі. Ёсць інфармацыя аб канцэрце, што адбыўся 2 жніўня 1919 г., якім дырыжыраваў трамбаніст Я.Райхман (выконваліся творы А.Спендыярава, А.Барадзіна, П.Чайкоўскага). Некалькі канцэртаў прагучала пад кіраўніцтвам вядомага артыста і дырыжора В.Р.Бакалейнікава. Можна меркаваць, што канцэрты адбыліся ў пачатку 1920 г., бо ў газеце "Известия Витебского губревкома и губкома РКП" за 20 студзеня паведамляецца: "Сёння ў Гарадскім тэатры — чарговы сімфанічны канцэрт. Пасля невялікага перапынку, выкліканага прыездам В. Бакалейнікава, зноў дырыжыруе Мікалай Малько, які паспеў за час свайго знаходжання ў Віцебску заваяваць трывалыя сімпатыі публікі, што наведвае канцэрты". З прыведзенай цытаты відаць, што сімфанічны аркестр на чале з М.А. Малько сярод аматараў музыкі карыстаўся вялікай папулярнасцю. Дзякуючы добраму прафесійнаму ўзроўню аркестр меў пастаянную аўдыторыю слухачоў, гэты працэс не быў стыхійным — стабільнасць публікі з'яўлялася характэрнай рысай выступленняў аркестра.

Пакуль з-за адсутнасці звестак няма магчымасці падрабязна разгледзець творчую дзейнасць вышэйназваных дырыжораў віцебскага перыяду. Але ў адным з

Репозиторий БГУКИ

пісьмаў М.А.Малько да М.Мяскоўскага нам удалося высветліць творчы падыход дырыжора Г.Шэйдлера: "... люблю ўсіх дырыжораў, але чакаю ад іх радасці, а вось Шэйдлер гэтай радасці не дае, ён халодны, наўрад ці таленавіты. Напэўна, па-свойму вопытны, а калі, акрамя таго, у ім выпрацаваліся добрасумленнасць і ўпартасць у рабоце, то гэта ўжо нямала..."

Дзейнасць Віцебскага сімфанічнага аркестра — яркая старонка музычнай культуры Беларусі. Як адзначаў мастацтвазнавец Б. Смольскі ў сваім інтэрв'ю, аркестр з Віцебска быў прафесійным калектывам і працягваў традыцыі развіцця аркестравага выканання Беларусі. З іншых калектываў ён быў найбольш падрыхтаваны па сваім складзе, меў даволі вялікую па тым часе нотную бібліятэку і найвышэйшага ўзроўню кіраўніка ў асобе М.А.Малько. Усё гэта дазволіла выконваць цікавы высокамастацкі рэпертуар і атрымаць прызнанне ў слухачоў.

Аднак у адпаведнасці з загадам № 15 Наркамасветы па Аддзеле Мастацтваў з 1 чэрвеня 1921 г. Віцебскі сімфанічны аркестр спыніў сваё існаванне: "У выніку неабходнасці скарачэння расходаў і пераходу прадпрыемства Аддзела ў рабоце на гаспадарчы прынцып самааплаты, а таксама ў сувязі з рэарганізацыяй Наркамасветы прапаную неадкладна, з 1 чэрвеня, распусціць дзяржаўны сімфанічны аркестр і замацаваць музыкантаў на прадпрыемствах".

Такім чынам, складанае сацыяльна-эканамічнае становішча ў краіне, новая эканамічная палітыка, пры якой аркестр павінен быў перайсці на гаспадарчы разлік, пазбавілі сімфанічны аркестр магчымасці функцыянавання. Яшчэ адна прычына знікнення аркестра як калектыву — ад'езд дырыжора М.А. Малько ў Маскву. Не знайшлося чалавека, які ўзначаліў бы аркестр і ўзяў бы на сябе праблемы, звязаныя з жыццядзейнасцю такога складанага арганізма, як сімфанічны аркестр.

Даследчы аналіз дзейнасці шэрага дырыжораў як мінулых гадоў, так і сучаснасці паказвае: у калектыўным

Репозиторий БГУКИ

выканальніцкім мастацтве вельмі патрэбная скіравальная індывідуальнасць. У аркестры гэтай індывідуальнасцю, як правіла, з'яўляецца асоба дырыжора.

---

1. Известия крестьянских, рабочих, красноармейских и батрацких депутатов. — 1919. — 8 июля.
2. Известия Витебского губревкома и губкома РКП. — 1920.—27 июля; 17 окт.
3. Малько Н.А. Воспоминания. Статьи. Письма. — Л., 1972. — С. 22, 99, 158, 212.

**Сялюціна С.В,**
магістр

## БІЗНЕС-БІБЛІЯТЭКІ

Валоданне неабходнай сучаснай дакладнай інфармацыяй становіцца дамініруючым фактарам для дасягнення поспехаў як у навуцы, прадпрымальніцтве, так і ў іншых сферах дзейнасці. Пераход да рынначных адносін стымуляваў імклівы рост попыту на дзелавую інфармацыю. Гэта абумовіла рэзкі рост патрабаванняў да яе якасці, аператыўнасці, што, у сваю чаргу, з'явілася магутным стымулам для ўзнікнення бізнес-бібліятэк, сектараў, кабінетаў дзелавой інфармацыі.

Дзейнасць гэтых сектараў накіравана на рашэнне наступных задач:

— высвятленне патэнцыяльных спажыўцоў інфармацыі;

— нязменнае вывучэнне інфармацыйных запытаў абанентаў;

— нязменнае вывучэнне інфармацыйных рэсурсаў рэгіёна;

— удасканаленне нормаў і метадаў абслугоўвання;

— фарміраванне фонду камерцыйнай, даведачнай, дзелавой інфармацыі.

Інфармацыйныя патрэбы прадпрымальнікаў, прадпрымальніцкіх асацыяцый, юрыстаў, эканамістаў,



Репозиторий БГУКИ